# INSTAGRAM ЯК ЭЛЕКТРОННЫ РЭСУРС - ДАПАМОЖНІК ДЛЯ ВЫВУЧЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

*Кароль І. Ю, Пінчук Я. І.*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Дапіра Т.П. – выкладчык*

У артыкуле разгледжана сацыяльная сетка Instagram як інтэрнэт-рэсурс, што можа быць прыдатны для вывучэння беларускай мовы і анлайн-адукацыі. Прыведзены прыклады тэматычных блогаў. Вызначаны плюсы і мінусы інтэрнэт-навучання.

У сучасным свеце Інтэрнэт лічыцца адной з галоўных крыніц адукацыйнай інфармацыі. Прадстаўленне звестак у кібернетычнай прасторы пастаянна змяняецца, узнікаюць новыя рэсурсы, дапаўняюцца старыя. Умелае выкарыстанне інтэрнэт-крыніц пашырае віды вучэбнай дзейнасці, эканоміць час на пошук неабходнай інфармацыі, робіць адукацыйны працэс больш эфектыўным [1].

Сусветная камп'ютарная сетка дае ўнікальныя магчымасці для дыялогу чалавека з навукай і культурай, а як вынік для ўсебаковага развіцця асобы. Укараненне інтэрнэт-тэхналогій у адукацыю дазваляе зрабіць навучанне больш індывідуалізаваным, дае магчымасць асвойваць матэрыял у сваім тэмпе, шукаць дадатковыя дадзеныя і заданні з розным узроўнем складанасці, удзельнічаць у творчых і групавых праектах.

Сёння на прасторах Інтэрнэту існуе бясконцая колькасць рэсурсаў, якія дазваляюць структураваць і аб'яднаць разнастайныя магчымасці анлайн-навучання. Адным з такіх рэсурсаў з'яўляецца сацыяльная сетка Instagram.

Instagram з'яўляецца амерыканскай сацыяльнай сеткай для абмену фатаграфіямі і відэа, заснаванай Кевінам Сістрам і Майкам Крыгерам. Прылада дазваляе карыстальнікам загружаць медыяфайлы, якія можна рэдагаваць з дапамогай фільтраў і арганізоўваць з дапамогай хэштэгаў і геаграфічных пазнак. Паведамленнямі можна дзяліцца публічна або з загадзя адабранымі падпісчыкамі. Карыстальнікі могуць праглядаць кантэнт іншых людзей па тэгах і месцазнаходжанні, а таксама знаёміцца з трэндавым матэрыялам [2]. Да снежня 2010 года ў Instagram быў адзін мільён зарэгістраваных карыстальнікаў. У чэрвені 2011 года — ужо пяць мільёнаў. Да верасня гэтая лічба падвоілася, а да сакавіка 2012 колькасць карыстальнікаў дасягнула амаль 30 мільёнаў. Пад канец лютага 2013 года Instagram абвясціў аб 100 мільёнах актыўных карыстальнікаў.

Папулярнасць дадатку справакавала з'яўленне мноства распрацовак, так ці інакш звязаных з Instagram. У якасці асобнага напрамку такіх распрацовак можна вылучыць праекты разнастайных прылад, прызначаных для працы з Instagram.

Дзякуючы свабодзе выбару тэматычнай накіраванасці свайго профілю, у Instagram існуе шэраг блогераў, старонкі якіх прысвечаны вывучэнню беларускай мовы:

Bielaruskija_havorki – старонка пра натуральную беларускую мову – жывую мову з першых вуснаў – што яшчэ захавалася ў натуральным асяродку. Падаецца шмат звестак пра гаворкі Барысаўскага павету. Вялікая ўвага надаецца матэрыялам пра ідыяматычнасць беларускай мовы.

Inna_belmova – профіль існуе ў першую чаргу для таго, каб паказаць багацце і прыгажосць беларускай мовы. У другую чаргу – для прэзентацыі паслуг рэпетытара па беларускай мове для школьнікаў.

Dasha.belmova – акаўнт першапачаткова задумваўся аўтаркай як дапаможнік вучням і бацькам, для анонсаў мерапрыемстваў і сустрэч у класе, падначаленым класнаму кіраўніку. З цягам часу блогер зразумела, што аўдыторыя больш шырокая па ўзросце і знаходзіцца тут для паглыблення сваіх ведаў па беларускай мове і літаратуры. Акрамя таго, блог дапамагае аўтарцы трансліраваць свой багаты вопыт у выкладанні названых школьных прадметаў і паказвае, што ў сучаснай школе ёсць настаўнікі, якія зацікаўлены ў павышэнні кампетэнцый сваіх вучняў з дапамогай самых сучасных інтэрнэт-тэхналогій. Вучням гэты блог прапануе разнастайныя рознаўзроўневыя тэсты і віктарыны.

Belmovarazam – пазнавальная старонка для тых, хто рыхтуецца да цэнтралізаванага тэсціравання і жадае ведаць мову на вельмі высокім узроўні. Змяшчаюцца тэарэтычныя матэрыялы для падрыхтоўкі да ЦТ па беларускай мове ў выглядзе кароткіх адаптаваных канспектаў па тэмах і невялікіх тэставых заданняў. Акрамя гэтага, прапанаваны раздзел "Хвілінка матывацыі" (для падтрымання псіхалагічнага настрою) і раздзел "За межамі ЦТ" (для развіцця пазнавальнага інтарэсу). Напачатку старонка была створана для канкрэтнага класа, але з цягам часу выйшла за гэтыя межы: колькасць падпісчыкаў з розных куткоў Беларусі, блізкага і нават далёкага замежжа стала актыўна павялічвацца.

Slavcentr – глабальна акаўнт рэкламуе і прасоўвае моўныя курсы па славянскіх мовах (польскай, чэшскай, славацкай) і іншыя паслугі. Змешчаны кантэнт, які прэзентуе і папулярызуе беларускую мову. Гэта свядомая аўтарская пазіцыя, як і мова, на якой вядзецца блог.

Alternative.museum – старонка пра гісторыю і культуру Беларусі. Развіваецца дзеля папулярызацыі беларускай культуры, каб паказаць, як можна крэатыўна і весела распавядаць пра гісторыю на роднай мове.

Lohkaja_mova – блог для тых, хто хоча пашырыць свой слоўнікавы запас на матчынай мове. У апісанні да кожнага слова прыводзіцца яго тлумачэнне і прыклады ўжывання з твораў вядомых беларускіх пісьменнікаў. Кожнае слова падаецца яшчэ і лацінскай графікай. Пасля падпіскі на гэты блог у вашай стужцы навін штодзень будуць з'яўляцца новыя словы, фразеалагізмы, прымаўкі і прыказкі, а таксама цытаты знакамітых людзей па-

беларуску. У праекта ёсць шэраг поспехаў: вялікая колькасць падпісчыкаў за даволі малы перыяд існавання блогу (запусцілі старонку ў красавіку 2020); у мінулым годзе выдалі друкаваныя каляндарыкі-слоўнікі на роднай мове, якія разышліся па ўсім свеце ў колькасці звыш 4 тысяч асобнікаў.

Хочацца адзначыць, што такі від інтэрнэт-навучання мае свае плюсы і мінусы. Напрыклад, станоўчымі рысамі можна назваць наступныя: эканомія часу паездак на вучобу і грошай на набыццё кніг, слоўнікаў, іншых школьных прыладаў; магчымасць вучыцца з любога месца свету, што дапаможа тым, хто надае шмат часу іншым сферам жыцця; псіхалагічны камфорт (індывідуальны тэмп заняткаў, няма трывожнасці ад выкліку да дошкі ці памылак у выкананні чаго-небудзь і г. д.)

Аднак ёсць і адваротны бок навучання ў Instagram: трэба надаваць пэўны час на адаптацыю на новай платформе; неабходна першапачаткова выдаткаваць сродкі на патрэбную тэхніку для вядзення блогу; выкладчыкам трэба перайсці на дыстанцыйны фармат выкладання, які досыць моцна адрозніваецца ад класічнага. Трэба адзначыць, што не ўсе рэсурсы маюць аднолькава якасную рэдактуру.

Выдаленая адукацыя зручна яшчэ і тым, што яна не мае жорсткіх тэрмінаў. Нават праграма ў большасці выпадкаў складаецца з улікам пажаданняў навучэнца, паслядоўнасць курсаў і тэмп навучання кожны выбірае сам, можна не баяцца “адлічэння з блогу”.

Важна тое, што ў інтэрнэце вучыцца можа кожны. Няма жорсткай верхняй мяжы, якой усталёўваецца, напрыклад, колькасць чалавек у групе, ды і груп, як такіх, няма. Усё індывідуальна. Да недахопаў жа можна аднесці яшчэ тое, што не кожны здольны самастойна працаваць, некаторым людзям значна прасцей вучыцца ў групе для дасягнення максімальнай эфектыўнасці.

Падводзячы вынік, неабходна сказаць, што анлайн-адукацыя, асабліва ў Instagram, - гэта зручна, сучасна, цікава. Індустрыя анлайн-навучання значна вырасла з 2000 года. Ніводная іншая падгаліна адукацыі не мела ў дадзены перыяд такога пашырэння. Калі і былі нейкія сумненні ў будучыні анлайн-навучання, яны былі скасаваны рознымі з’явамі рэальнасці, напрыклад, пандэміяй Covid-19. Аднак трэба дакладна ўсведамляць, што Instagram як інтэрнэт-рэсурс не здольны замяніць настаўніка, які звыкла працуе каля дошкі ў класе, або выкладчыка, які традыцыйна навучае студэнтаў, што сацыяльная сетка не закрые ўсіх прабелаў у ведах навучэнца, не вырашыць яго асабістыя праблемы, не “ўкладзе” ў яго галаву патрэбныя веды, не раскрые своечасова яго творчы патэнцыял, не будзе хвалявацца за яго поспехі і няўдачы так, як гэта можа рабіць сапраўдны педагог.

***Спіс выкарыстаных крыніц:***

*1. Русак, В. У. Адукацыйныя інтэрнэт-рэсурсы ў сферы вывучэння і выкладання беларускай мовы [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: https://elib.belstu.by/bitstream/123456789/40377/1/Русак_Адукацыйныя.pdf – Дата доступу: 10.04.2022.*

*2. Instagram [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: https://ru.wikipedia.org/?curid=3419486&oldid=120897479 – Дата доступу: 10.04.2022.*

*3. Формы дыстанцыйнага навучання. Адукацыя па Інтэрнэце [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу https://be.birmiss.com/%D1%84%D0%BE%D1%80%D0%BC%D1%8B-%D0%B4%D1%8B%D1%81%D1%82%D0%B0%D0%BD%D1%86%D1%8B%D0%B9%D0%BD%D0%B0%D0%B3%D0%B0-%D0%BD%D0%B0%D0%B2%D1%83%D1%87%D0%B0%D0%BD%D0%BD%D1%8F/ – Дата доступу: 10.04.2022.*